# І Форум рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі Беларусі і КНР адкрыецца 21 лістапада

20.11.2023 16:40

**На базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбудзецца пленарнае пасяджэнне форуму. З прывітальным словам перад яго ўдзельнікамі выступяць Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Се Сяаюн, кіраўніцтва Міністэрства адукацыі нашай краіны, старшыня Рэспубліканскага савета рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэктар БДУІР Вадзім Богуш, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін.**

У рамках пленарнага пасяджэнння плануецца падпісанне Пагаднення аб стварэнні кітайска-беларускай асацыяцыі ўніверсітэтаў.

У другой палове дня ўдзельнікаў форуму чакаюць тры тэматычныя секцыі на базе сталічных ВНУ. Так, у БДУІР пройдзе секцыя «Развіццё лічбавай адукаванасці навучэнцаў інтэлектуальнай эпохі». У БДУ абмяркуюць прымяненне лічбавых тэхналогій пры арганізацыі адукацыйнага працэсу, у БНТУ — дыстанцыйнае навучанне і сумесныя адукацыйныя праграмы.

У праграме форуму — наведванне дэлегацыяй Кітайскай Народнай Рэспублікі Індустрыяльнага парку «Вялікі камень», а таксама правядзенне двухбаковых сустрэч.

**Надзея НІКАЛАЕВА**